Маланка
1926
Паасобныя №№

Przesyłka pocztowa opłacona ryczałtem.
ГОД ВЫДАНЬНЯ ПЕРШЫ

АСОБНЫ НУМАР 30 ГРОШ.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:	№ 11	ПАДПІСНАЯ ЦАНА:
ВІЛЬНЯ, Віленская вул., № 12, кв. 6	1-га ЧЭРВЕНЯ.	на 1 год 8 злот. „ паўгоду 4 „ „ тры мес. 2 „ „ адзін м. 1 „ — За граніцу: на год—тры даляры, на паўгоду—1 д. і 50 цэнт.
«МАЛАНКА»	1926 г.	

Адно з нашых балючых жаданьняў.

Рыс. Ю. Ш.

Падняўся ў гору сьцяг вясёла,
На ім магутны, вольны кліч:
„Няхай жыве наша школа!
„Няхай гарыць асьветы зьніч!“

Мы верым — ўзыйдзе ясна сонца,
Асьвеціць родны наш загон,
Засьвеціць ў хатку празваконца...
Бо ўжо Грабскі — толькі сон...

Ух-я! Ух-я!

Былі ў Польшчы тры паны, —
Ух-я! Ух-я!
Тоўстапузыя яны:
Ух-я! Ух-я!
Грабскі, Кернік і Вітос...
Ух-я! Ух-я!
Чорт аднак і іх панёс!
Ух-я! Ух-я!
Асьветай Грабскі кіраваў:
Ух-я! Ух-я!
Усе школы закрываў.
Ух-я! Ух-я!
Казаў Кернік зямлю дам:
Ух-я! Ух-я!
Асаднікам, а... ня нам.
Ух-я! Ух-я!
Вітас — стары верабей,
Ух-я! Ух-я!
Казаў хлопцы „не рабей!“
Ух-я! Ух-я!
Хлеба дам і цёплы кут...
Ух-я! Ух-я!
[illegible]шоткай, а... ня тут.
Ух-я! Ух-я!
[illegible] іх няма ні знаку, —
Ух-я! Ух-я!
[illegible]шалкай... па фраку!
Ух-я! Ух-я!
[illegible] цяпер будзе іначай, —
Ух-я! Ух-я!
Пажывем, — тагды пабачым!
Ух-я! Ух-я!

Я. М.

„Рэнумэрацыя“.

Дырэктар дзяржаўнага сьпіртавога манаполю Падкаморскі адтрымаў апрача пэнсіі яшчэ і *„рэнумэрацыю“* (нагараду) лікам 28.899 злотых, а дырэктар дзярж. табачнага монополю адтрымаў 23.785 зл., а памочнікі іх таксама адтрымлівалі гэткія-ж *„рэнумэрацыі“* ў суме ад 15.796 да 7.—8,000 злот.

(З газэт).

Голь-бяда гуляе ў краі,
Пролетары ледзьве дыша,
Дырэктораў чорна зграя
„Рэнумэрацкі“ сабе піша.

Да людзкой бяды-нядолі
Сэрца іх, як камень, глуха;
Ім ніколі не даволі, —
Ненасытна іхна бруха!

Ошчэндзаюць, рэдукуюць,
Каб напхаць як мех скарбовы
І падаткі ўсьцяж шыкуюць
Нават з сьвінкі і з каровы.

Мрэць бяз працы безработны,
Высах ён: скура ды косьці, —
Цяжкі лёс яго гаротны,
Бо у краі *ошчэндносьці*!

Не даюць нам роднай школы:
— *Нéма сьродкув, „ошчэндносьці“*,—
Наш вучыцель босы, голы
Вые з голаду і злосьці.

Толькі панам дырэкторам
Ня прыходзіць ў голаў штосьці,
Што ганебны грэх і сорам
Браць людзкія *ошчэндносьці*.

Янка Маланка.

Крапіва.

Воўк і ягнюк.

(*Пановяму*).

Закон наш добры — няма слоў,
Казаў калісь нам дзед Крылоў,
Але вось толькі ў чым бяда —
Яго выконвае брыда.

„Удужага заўсёды слабы вінават.
Яно так ёсьць і далей будзе“ —
Даўней казалі гэтак людзі,
Але цяпер ваўкі ягнят
Ядуць няначай па дэкрэту *);
Вось нек было і ў гэта лета:
Траву за вёскай каля рэчкі

Шчапалі, ходзячы, авечкі,
А воўк стары ў лазе сядзеў,
Глядзеў,
Сачыў,
Разоў мо' пяць пералічыў,
Але чапаць баяўся ён,
Бо быў юрысты, знаў закон.

Вось тут якраз
На гэты час
Адзін баранчык малады,
Ня чуючы ліхой бяды,
Спусьціўся з берагу напіцца,
А воўк. як за патрэбай быццам,
З-за куста — шуг!
Баран жа з жаху ў воду — бух!
Ды стаў тапіцца.
І утапіўся-б бязумоўна,
Каб воўк ня выцягнуў за воўну.

— Дык ты тут ловіш рыбу незаконна,
Ня гледзячы на забарону? —
Крычыць сярдзіта хітры зьвер:
Што-ж мне з табой рабіць цяпер?

— Паночку воўк! — баран ў адказ —
Павер: дальбог я незнарок,
Даруй-жа мне на гэты раз,
А больш — даю зарок...

— Маўчы, шчанюк, з сваім зарокам, —
Сказаў воўк, злуючы нарокам:
Я за табой даўно сачыў —
Ты вось і скуру падмачыў,
Зрабіўшы шмат рэспубліцы урону.
А ведаеш, што па закону
Было-б табе за ўсё за гэта?
Паводле нашага дэкрэта,
Цябе-б адразу к высшай меры кары.

Але як ты ўжо пролетары,
Дык я прымушан так рашыць:
Ты тут павінен распрануцца
І скуру зараз прасушыць,
Каб ня згніла яна і воўна,
Слабоду-ж я даю табе... умоўна *).
Ня ўсьпеў баран тут аглянуцца,
Ратунку крыкнуць ці заплакаць,
Як воўк пачаў яго распратаць.

*) *Дэкрэт* — распараджэньне, наказ высшай ўлады.

*) *Даваць свабоду умоўна*, — зн. даваць толькі на паперы, абяцаць, але ня даць.

(*Паясьненьні Рэдакцыі*).

На кірмашы.

Сялянка праз няўвагу наступіла жонцы камэнданта пастарунку на нагу.

— *Цо ты хамувка дэпчэш мне пантофле*, — гнеўна закрычала камэнданціха.

— А бадай вас ліха гэтых паноў! — адказала сялянка, — ў іх нават чаравікі панамі завуцца.

Я. М.

Яшчэ за часаў цара Мікалая І-га адзін поп вельмі стараўся, каб заслужыць ласку ў начальства, а дзеля таго рознымі хітрыкамі змушаў сялян-каталікоў пераходзіць на праваслаўе. У гэтым яму чынна памагаў царкоўны стараста — мясцовы абшарнік.

Начальства пазнаўшы іхнія „заслугі“ прадставіла к наградзе: папу — камілаўку старасьце — крыж Станіслава III ст. Але Сьвяцейшы Сынод перапутаў і ў паперах ад'значыў, што крыж — папу, камілаўку — старасьце.

Каб паправіць памылку Сыноду, поп і стараста падалі „усепадданейшую“ просьбу да цара.

Цар, аднак, адказаў, што Сьвяцейшы Сынод непамыльны, а ўжо данныя награды можа адабраць толькі суд пры адабраньні ўсіх правоў.

Вось і прыходзілася нашаму старасьце-абшарніку на ўсе ўрачыстыя царады надзяваць побач з сваею дваранскаю формаю яшчэ і камілаўку, чым заўсёды выклікаў зразумелы і нічым нястрыманы сьмех. **К. Сьвет...**

І... „мы пахалі“...

(Справаздача аб „беларускім“ мітынгу).

30 га траўня, г. знач. толькі пазаўчора яшчэ, у Вільні замітынгавалі:
Легіяністыя.
Асаднікі.
Дворнікі.
Настаўнікі.
Стральцы
і г. д.

Адным словам — усё, што ёсьць тут левае і польскае.

Аблявела неяк таямніча і „Тымчасова Рада Бялоруска“...

І таксама абвясьціла мітынг —

У тэй самай салі Крэйнгеля, дзе яна калісьці на сьвет нарадзілася.

Іду. Ведаючы праўдзівы ўплыў на грамадзянства гэтай вечнатымчасовай пасткі, расстаўленай для беларусаў збанкрутаваўшымі эндэцкімі ўладамі Польшчы, гадаю:

Што-ж гэта мае быць за мітынг такі?..

Аж гадаць доўга ня прыходзіцца.

На ваконечку касы чытаю, што ніякага мітынгу тут быць ня можа, бо... ёсьць мітынг у „Салі Мейскей“...

Ну, пэўна-ж, сьмешна выглядаў-бы мітынг, на які ніхто ня прыйшоў, навет ніводзін рэпортэр тутэйшай прэсы (калі ня лічыць мяне — маланачніка).

Ня мне-ж аднаму мітынгаваць з прэзэсам „Тымчасовэй“!

Далей чытаю, што мітынг „Тымчасовэй Рады“ „*саўпаў*“ (гэтае тымчасова-беларускае слоўца літаральна так і выпісана на абвестцы), значыцца — *саўпаў* — з мітынгам у „Салі Мейскей“, а дзеля гэтага ўсе заклікаюцца туды.

Дзеля таго, што ў с[illegible] я ўжо пабываў, але н[illegible] шы страшэннае дух[illegible] змогшы добра чуць [illegible] фістулаватым фальц[illegible] сьпяшыў выйсьці на [illegible] дабрацца да Салі [illegible] дык назад у „Мейск[illegible] ўжо не пайшоў.

А саля Крэйнгеля б[illegible] толькі што пусьцюсенькая, [illegible] вет дзьверы да яе яшчэ [illegible] дольных сходах былі моцна зачынены на ключ.

Гэтак рэагавала беларускае грамадзянства на заклік „Тымчасовэй Рады“ зрабіць мітынг.

Мітынг гэты прайшоў гэтак ціха і спакойна, як ніводзін іншы нідзе на сьвеце.

З—ык.

Заграні́чны гумар.

Бедны, бедны „дух Лёкарно“
Уцякае ва ўсе ногі,
Бо у мамы у Эўропы
Многа жаху і трывогі.

Чорны хмары над Эўропай,
Дзе ні глянеш, дзе ні пойдзеш.
Дзе-ж „анёлку“ супачынеш?
Дзе спакой нарэшце знойдзеш?!

(Нямецкая карыкат.)

Вось як выглядае новая эўрапэйская роўнавага, або „Саюз бясьпечнасьці“, над якім уся Эўропа і Ліга Народаў ламае сабе галаву.

(Амстэрдам — Голяндыя).

Крычыць Францыя на сьвет цэлы:
— Гвалт! Ратуйце! У дзень белы
Немец зброіцца паціху, —
Быць ідацць якомусь ліху!

А сама зброі болей пуда
Начапляла і, як Юда,
Яна „анёлка“ ўжо цалуе...
І у друзаў бомбы дуе!

(Нямецкая карыкат.)

Новая партыя.

Кажуць, што ў сувязі з Варшаўскімі падзеямі, сярод польскай ...віцы паўстала новая ...Ю. П. К.“ — гэта зна... ...куфры, пакуй куфры!“ ...заграніцу).
... дададзем:
...айхутчэй!

Я. М.

І ён ня хоча...

— А ты, Мацей, ці хацеў-бы быць прэзыдэнтам?

— А ліха яго там: яшчэ заб'юць, альбо прагоняць. Найлепш у хаце — сядзі, ды маўчы.

Я. М.

НАША ПОШТА.

Усіх паважаемых нашых падпісчыкаў „Маланкі“ паведамляем, што з прычыны настаўшай добрай пагоды некаторыя нашыя супрацоўнікі выехалі на летні адпачынак на лета на вёску, што змусіла нашу „Маланку“ выходзіць часова толькі раз на месяц. Але запэўняем, што гэта толькі часова і сабраўшыся на сілах хутка пачнём зноў выпускаць „Маланку“ нармальным парадкам. Усім паважаным падпісчыкам, якія прыслалі грошы, або прышлюць і не адтрымалі або не адтрымаюць усіх належачых нумароў прадоўжым падпіску на даўжэйшы час.

Заклікаем усіх дарагіх братоў беларусаў, якім ляжыць на сэрцы разьвіцьцё нашай ідэйна-гумарыстычнай часопісі, падтрымліваць матар'яльна наша выдавецтва прысылаючы нам падпіску і пашыраючы шырока „Маланку“ сярод вашых сваякоў і знаёмых.

ПАВІНШАВАНЬНЕ.

Рэдакцыя „Маланкі“ на гэтым месцы складвае нашаму супрацоўніку і маладому мастаку Ю. Ш...... свае сардэчнае павіншаваньне з прычыны шчасьлівага зпажэньня ім матуральных экзамэнаў пры Віленскай Беларускай Гімназіі.

Мы верым, што распачатая Вамі праца для дабра нашай дарагой Беларусі, будзе заўсёды сьвяціць Вам, як пуцяводная зорка, і дасьць Вам сілу і радасьць жыцьцёвую у штодзенным і цяжкім змаганьні.

Рэдактар-выдавец М. Луцэвіч. Друкарня Б. Клецкіна, Вільня